чаты імітавалі пасеў травы, а хлопец-саліст паказваў яе кашэнне. На правабярэжжы Прыпяці (Лельчыцкі, Нараўлянскі р-ны) танец, які выконваўся пад песню «Касіў Ясь Канюшыну...», пераходзіў у музыч. гульні. На Брэстчыне танец суправаджаўся песняй: «На балоце касар косіць, // Кінуў косу ды галосіць: // Ці ты, мая каса, тупа? // Ці ты мая жонка скупа? // Мая каса не тупая, // Мая жонка не скупая...» На Магілёўшчыне (в. Любонічы Кіраўскага р-на) «К.» адносіцца да зімовай карагоднай традыцыі і ўваходзіць у групу танц. карагодаў (мясц. назва «Касарэ»). Выконваецца мяшаным складам любой колькасцю чалавек, пераважна жанчын. Карагоднікі, утварыўшы паўкола, злучаюць унізе рукі. Паўкола з 2 бакоў «замыкаюць» мужчыны—«гусакі». Сустрэўшыся і павітаўшыся (паўкола складваецца папалам, затым прымае пачатковую форму), удзельнікі карагода рухаюцца спружыністым акцэнтаваным трохкрокам-бегам за першым «гусаком». Ён, выварочваючы паўкола (спінамі ў сярэдзіну), заводзіць усіх на другі бок пляцоўкі, затым у «арку» (вароты), утвораную ўзнятымі рукамі другога «гусака» і жанчыны справа ад яго. Карагод шматразова рухаецца па коле ў тым жа кірунку і пачаргова праходзіць у новаўтвораныя «аркі». За кожным разам адзін з удзельнікаў апускае злучаныя рукі на плячо таго, хто стаіць наперадзе. Утварыўшы «пляцёнку», першы «гусак» раскручвае яе, шматразова рухаючыся па коле ў адваротны бок да ўтварэння паўкола. Затым карагод паўтараецца спачатку. Кампазіцыю арганізоўвае такім жа чынам другі «гусак». Танец «К.» суправаджаецца найгрышам і песняй: «А пад мостам рыба з хвостам. // Прыпеў: Гэй, гэй, касарэ, // Вы касарыкі мае. // А ў суседа дзяўчына работаць не ўмее, // Рабіць — не прыбіць, жаці — не перагнецца, // Як пачуе скрыпкі-рыпкі, як ні перарвецца...» (прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка). У адным з карагодных варыянтаў танца «касец», рухаючыся ў сярэдзіне кола, выбіраў сабе дзяўчыну. У пач. 1970-х гг. матыў «К.» выкарыстаў бел. харэограф В.Ямінскі (Мінскі ансамбль танца «Радуга») і стварыў сцэнічную версію танца пад назвай «Касіў Ясь канюшыну».

*Літ.*: Алексютович Л. Белорусские народные танцы, хороводы, игры. Минск, 1978; Чурко Ю. Белорусский хореографический фольклор. Минск, 1990. *М.А.Козенка.*

**КАСА́Ч** Павел Мікалаевіч (20.11.1887, в. Рагава Мінскага р-на — 7.12.1977), беларускі дзеяч аматарскага мастацтва, кампазітар. Засл. дзеяч культуры Беларусі (1957). Скончыў Магілёўскі пед. ін-т (1938). З 1907 у капэле Д.Агрэнева-Славянскага. У 1912—56 настаўнічаў. У 1946 арганізаваў хор студэнтаў у Нясвіжскім пед. вучылішчы, у 1952—64 узначальваў хор сельскага клуба в. Лявонавічы Нясвіжскага р-на), які пад яго кіраўніцтвам дасягнуў значнага выканальніцкага майстэрства, атрымаў званне «народны аматарскі калектыў». Аўтар шэрага песень, у т.л. «Хораша вясною хадзіцца», «Мой Нёман», «Беларусь мая», «Цімох», «Выйдзі, дзяўчына», «Кланялася жыта»; апрацовак бел. нар. песень («Жніўная», «Ой, сівы конь бяжыць» і інш.).

**КАСЕ́ЦКІЯ ПЕ́СНІ**, пакосныя песні, група летніх песень беларускага каляндарна-абрадавага цыкла. Былі прымеркаваны да касьбы і сенавання. Як казалі ў народзе, касьбу трэба было пачынаць «з Пятрова дня», калі «ў полі пожня, зялёны пакос», а завяршаць да дня прарока Ільі, таму што паводле нар. уяўленняў, «прыдзе Ілля, наробіць гнілля», г.зн. будзе цяжка высушыць накошанае сена нават на кусце. Таму асаблівае пажаданне касцоў — добрае надвор'е: «Касцы косяць, // Бога просяць: // — Дай, Божа, пагоданьку // На нашу работаньку, // Сена пакасіці // Да дому звазіці». У К.п. знайшла ўвасабленне цяжкая праца парабка-касца, які працуе па найме ў пана. Так, у песні «Ой, да бокам, хмарачка, бокам» парабкі «на панскіх сенажацях, сена косяць і ў Бога дажджу просяць: — А дай нясі, Божа, валачок, // Нанясі, Божа, валачок, // А дай няхай аддыша наш бачок, // Няхай аддыша наш бачок». Праца касца набывае ў К.п. маст. адценне («Касары косяць, ветрык павявае, шаўкова трава на касу налягае»), разгортваецца ў эпічнай прасторы («...Пакосяць усе горы й далі»), малюе быт. адносіны паміж касцом і яго жонкай, якая «прынесла палуднаваць, у маленькім адлівачку, і хлеба скарыначку, цыбулькі быліначку, і солі драбіначку. Важнае месца ў К.п. займаюць любоўныя матывы і тэма кахання, у прыватнасці гатоўнасць хлопца да шлюбу. За ўхваленнем яго прыгажосці і незвычайнай магіяй яго дзеянняў прыхаваны эратычныя матывы: ...Ён каня сядлае, // Як мак зацвітае, // На каня садзіцца // Аж конь весяліцца, // Па вулушкі едзе, // Аж вулушка стогне, // Праязджае па лугах, лугах — // Лугі зеленеюць, // Праязджае па садах, садах, // Сады зацвітаюць. Дзеючымі асобамі ў К.п. выступаюць касец, яго жонка, маладая ўдовачка, прыгожыя дзяўчаты і хлопец. У кожнага з іх свая «роля», што разгортваецца ў натуральным асяроддзі вобразаў прыроды — скошанай травы, сонца, ветрыка, лугу, хмар. Даследчыкі адзначаюць шырокую распаўсюджанасць у Беларусі варыянтаў песні «На балоце касец косіць» (А.С.Ліс). К.п. ў маст. форме адлюстравалі важную старонку колішняга жыцця народа і ў гэтым сэнсе маюць эстэтычную і выхаваўчую каштоўнасць.

*Літ.*: Ліс А.С. Каляндарна-абрадавая творчасць беларусаў: Сістэма жанраў: Эстэтычны аспект. Мінск, 1998. *А.М.Аляхновіч.*

**КАСКА́Д** (ад франц. cascade вадаспад), 1) архітэктурны комплекс, састаўной часткай якога з'яўляецца невял. штучны вадаскід ці сістэма вадаскідаў. 2) Акрабатычны прыём, які